

# Сафія Федаровіч

Сафія Федаровіч – сцэнографка, мастачка, адна з заснавальніц сцэнічных традыцыяў сучаснага брытанскага балету – нарадзілася ў 1893 годзе ў Мінску ў інтэлігентнай каталіцкай сям'і доктара.  Федаровічы – старажытны беларускі шляхецкі род са Случчыны. Сафію хрысцілі ў Архікатэдральным саборы Найсвяцейшага Імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску. Тут сама, у сталіцы Беларусі, прайшло ейнае дзяцінства. У Мінску закончыла жаночую гімназію, дзе пачала займацца мастацтвам. Вучылася ў Кракаве, Маскве і, магчыма, Пецярбурзе. Пасля бальшавіцка-польскае вайны Сафія Федаровіч з роднага Мінску ў 1922 годзе пераехала ў Парыж: удзень займалася мастацтвам, а начамі працавала таксоўцай – яна адна з першых у Еўропе шафёрак. У 1924 годзе польскі часопіс для кабет Pani прысвяціў Сафіі Федаровіч рэпартаж "Мастачка-шафёрка", дзе пісалася: "Яе з маленства прыцягвалі дзве рэчы: жывапіс і тэхніка. Здавалася б, узаемавыключальныя рэчы, але ў ейнай душы яны ўтвараюць дзіўную гармонію. Яна любіць рухавыя машыны, любіць гучныя лакаматывы, але ёй хочацца і трэба маляваць".

Сафія пачынала тварыць у рэчышчы моднага тады кубізму, бачыла свет у рознакаляровых геаметрычных плямах, што з размахам і імпэтам змяшчала тады на сваіх на палотнах. Ейны жывапіс з сярэдзіны 1920-х, мяркуючы з часопісных рэпрадукцыяў, быў у духу фтутурызму. На жаль, з тагачаснага даваеннага перыяду творчасці мастачкі мала што ацалела. Федаровіч дэманстравала свае карціны на значных мастацкіх выставах, у тым ліку расійскіх (у Лондане, галерэя Whitechapel) і польскіх – у Парыжы (1922) і ў Бруселі (1928). Тэатральныя працы і жывапіс (партрэты і нацюрморты) экспанаваліся на выставах Лонданскай групы (1921–23, 1925–30, 1932), у галерэях Beaux-Arts і Leicester у Лондане. У 1920-ыя неаднаразова выстаўляла працы на прэстыжных штогадовых Восеньскім салоне і Незалежным салоне ў Парыжы.

Сафія Федаровіч здабыла сусветную вядомасць як дызайнерка сцэнічных

касцюмаў і тэатральная мастачка. Была мастачкаю першае сталае англійскае трупы Ballet Club (з 1934 – Ballet Rambert), дзякуючы чаму атрымала прызнанне як адна з заснавальніц сцэнічных традыцыяў сучаснага брытанскага балету. Шмат гадоў супрацоўнічала з брытанскім балетмайстрам і харэографам Фрэдэрыкам Эштанам. Аформіла больш за дзесяць ягоных пастановак: “Трагедыя моды” на музыку Ю. Ґусэнза (супольны дэбют, тэатр “Лірык”, 1926), “Маскі” Ф. Пуленка (1933), “Гараскоп” К. Лэмбэрта (1938, Sadler’s Wells Ballet), “Дантэ-Саната” на музыку Ф. Ліста (1940), “Адэлаіда, або Мова кветак” на музыку М. Равэля (1947) ды інш. Працавала таксама з харэографамі Нінэт дэ Валюа, Андрэ Гаўард, Майклам Сомзам. Стварыла сцэнаграфію спектаклю “Венецыянскі купец” Шэкспіра, пастаўленага ў 1947 годзе ў Шэкспіраўскім мемарыяльным тэатры ў Стрэтфардзе-на-Эйване. Працавала з рэжысёрам Пітэрам Брукам (“Зімовая казка” Шэкспіра, 1951, тэатр “Фенікс”).

Спраектавала і распісала дэкарацыі да операў “Травіята” Вэрдзі ў Ковэнт-Ґардэне, “Мадам Батэрфляй” і “Тоска” Пуччыні (1950). Яшчэ ў Парыжы пачала выкарыстоўваць англійскую версію свайго імя і прозвішча – Sophie Fedoro-vitch. Каля 1930 года мастачка пераехала ў Лондан, дзе прыняла брытанскае грамадзянства ў 1940-м. Жыла ва ўласным доме ў гатычным стылі ў раёне Чэлсі да свае заўчаснае смерці ў 1953 годзе ў выніку выпадковага атручэння газам. Шматлікія эскізы і праекты славутае мастачкі захоўваюцца цяпер у калекцыі брытанскага Музею Вікторʼі і Элбэрта. Да трэцяе гадавіны смерці Сафіі Федаровіч, у 1956-м, гэты музей зладзіў мемарыяльную выставу, што абʼехала шэраг найбуйнейшых гарадоў Вялікай Брытаніі.

Сафія Федаровіч – беларуская мастачка, якая нарадзілася і вырасла ў сталіцы Беларусі ў беларускай сямʼі. У Мінску атрымала гімназічную адукацыю і пачала займацца мастацтвам. Далейшая ейная творчасць звязаная з Польшчаю, Францыяй і Вялікаю Брытаніяй. Менавіта ў Брытаніі, ужо як сталая мастачка, у сярэднім веку, яна здабыла сабе найбольшую славу.